УДК 282

# ПРАТЭСТАНТЫЗМ 2.0, АЛЬБО КУДЫ КРОЧЫЦЬ НЯМЕЦКІ КАТАЛІЦЫЗМ XXI СТАГОДДЗЯ

**Аношка Сяргей Анантольевіч,**
Uniwersytet Kardynała Stefana Wyszyńskiego
(г. Варшава, Польшча)

*2018 год у нямецкім Каталіцкім касцёле смела можна назваць катастрафічным. Змены ў навучанні, акцэптацыя гомасексуальных кандыдатаў на святарства, святая Камунія для пратэстантаў, антыцыпацыя ліквідацыі цэлібату ды маральна-звычаёвая рэвалюцыя. Усё гэта дыяметральна змяняе падставы сучаснага каталіцызму, нагадваючы хутчэй не рэформу ва ўлонні Касцёла, але новую Рэфармацыю. Найгоршае аднак тое, што большасць зменаў была ўведзеная пад эгідаю вернасці духу апостальскай адгартацыі папы Францішка Amoris laetitia.*

31 снежня 2018 г. кард. Райнхард Маркс, старшыня Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Нямеччыне, выступіў з прамоваю ў катэдры Мюнхена. Падчас прамовы пурпурат наўпрост сказаў, што неўзабаве вера зменіцца, бо яна мусіць быць бліжэйшая чаканням верных. Асноўнымі пастулатамі былі канцылярызм, большая роля свецкіх асоб ды павялічэнне ролі асабістага сумлення вернікаў. Традыцыя Касцёла, казаў кардынал Маркс, надаль істотная, але варта "ісці ў будучыню". Пра тое, у што гэта выльецца на практыцы, сказана аднак не было. Аднак па тым, што адбываецца сёння ў нямецкім Каталіцкім касцёле, можа здагадацца, што кардынал хутчэй не выступаў у якасці прарока, але, маўляў, звычайнага сведкі, які канстатуе навакольную рэчаіснасць.

Беспасрэднаю прычынаю змен, якія немцы ўводзяць у каталіцкае навучанне, стала, як здаецца, адгартацыя Францішка "Радасць любові" (лац.: *Amoris laetitia*). Першы крок у бок "адноўленага каталіцызму" быў здзейснены ў лютым 2017 г., калі біскупы вырашылі дапускаць да святой Камуніі людзей па разводзе, што жывуць у новых несакрамэнтальных саюзах, хаця кананічнае права Касцёла выразна забараняе чыніць нешта падобнае [1, с. 298]. Яшчэ ў 1968 г. немцы ў Дэкларацыі з Кёнігштайн выказваліся непаслухмянствам адносна энцыклікі папы Паўла VI *Humane vitae*, сцвярджаючы прымат уласнага сумлення вернікаў над вытычнымі ўзгаданага дакумента ў справах антыканцэпцыі [3, с. 125-126]. Зараз біскупы выкарысталі падобную логіку ў дачыненні да асоб у паўторных шлюбах. Нямецкі Епіскапат спаслаўся на нібыта новае разуменне катэгорыі "сумленне", якое з'явілася ў адгартацыі Францішка: "Мы пакліканыя фарміраваць сумленне, а не дабівацца яго замены" [6, с. 27].

Тое стала першым крокам стварэння "новага, абноўленага" Касцёла ў Нямеччыне. Таму цалкам нядзіўна, што Вальтэр Каспер, адзін з найбольш уплывовых ліберальных ватыканскіх кардыналаў, які з'яўляецца дарадцам Францішка, назваў *Amoris laetitia* дакументам тысячагоддзя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2018 год у нямецкім Касцёле распачаўся ад абвяшчэння праекта дакумента, паводле якога да святой Камуніі ў некаторых выпадках варта дапускаць пратэстантаў. Меліся на ўвазе асобы, што састаяць у шлюбе з католікамі і маюць “непераадоленае прагненне” прыступіць да Эўхарыстыі. Некалькі іерархаў на чале з арцыбіскупам Кёльна кард. Райнэрам М. Вёлькі супрацівіліся так пастаўленаму пытанню і вырашылі з гэтай справай звярнуцца да Апостальскага Пасада. Вынікам бунту сямі нямецкіх біскупаў стала забарона публікацыі праекта дакумента, якую кардыналу Р. Марксу выслала ватыканская Кангрэгацыя Веравучэння. Але перамога была толькі ўяўнаю: кард. Р. Маркс асабіста сустрэўся з Францішкам, і той дазволіў яму апублікаваць дакумент пра Камунію для пратэстантаў. Сам пантыфік выказаўся, што гэта вельмі добры дакумент, праўда, не для ўсяго Касцёла ў Нямеччыне, але для выбраных дыяцэзій [5].

У чэрвені 2018 г. кард. Маркс апублікаваў тэкст у якасці прапановы для біскупаў; ад таго часу адзін па адным біскупы прымаюць той дакумент на падуладных ім касцёльных тэрыторыях. У якасці ключавой інспірацыі ў тым дакуменце спасылка рабілася на, як лёгка здагадацца, *Amoris laetitia*.

Нямецкія біскупы таксама абвесцілі пра магчымыя змены ў галіне маральнага навучання Касцёла ў сферы сексуальнасці чалавека. Мэтаю гэтых людзей з’яўляецца рэабілітацыя гомасексуалізма, якая можа распачацца, паводле слоў намесніка старшыні Епіскапата, біскупа Франца-Ёзэфа Бодэ з Оснабрук, з дабраслаўленняў у касцёлах аднаполых шлюбаў. Крыху пазней тое самае паўтарыў сам старшыня, кард. Маркс. Нягледзячы на тое, што восенню 2018 г. быў апублікаваны рапарт адносна сексуальных злоўжыванняў каталіцкіх святароў супраць непаўнагадовых, дадзеныя якога выразна сведчаць пра абсалютную дамінацыю на гэтай глебе злачынстваў гомасексуальнага характара, тое не перашкаджае нямецкім біскупам надаль абвяшчаць свае паталагічныя хворыя погляды.

Але што на тое Ватыкан? У верасні 2018 г. Апостальская Сталіца не выдала дазвол *nihil obstat* езуіцкаму прафесару Ансгару Вухерпфенінгу на выканання функцыі рэктара тэалагічна-філасофскай вучэльні ў Франкфурце на чарговую двухгадовую кадэнцыю. Прычына: ерась. Святар-вучоны выказваўся наконт дыяканату жанчын, абвяшчаў, што Біблія не забараняе аднаполых сувязяў, а, значыць, тое дае яму права дабраслаўляць саюзы гомасексуалістаў. Пастава Ватыкана абурыла як нямецкі Епіскапат, так і ўлады нямецкай правінцыі езуітаў [2]. Біскупы пастанавілі ўмяшацца ў справу і звярнуцца ў Ватыкан: рэктар-ерэтык застаўся на сваёй пасадзе.

Змены, бадай, чакаюць і шэрагі саміх святароў Нямеччыны. Каталіцкі касцёл не высвячае на ксяндзоў асоб гомасексуальнай арыентацыі, пра што, зрэштаю, апошнім часам узгадаў нават сам Францішак [4, с. 319]. Праўда, афіцыйнае навучанне Касцёла мала цікавіць некаторых нямецкіх біскупаў, як, напрыклад, Франца Юнга з Вюрцбурга. Для ліберальных біскупаў няма розніцы: ці святар мае гомасексуальную, ці гетэрасексуальную арыентацыю, галоўнае, абы захоўваў цэлібат. Аднак дадзены аргумент таксама ўжо здаецца быць не актуальным, бо немцы жадаюць адмяніць цэлібат, які лічыцца (памылкова, зрэштаю) галоўнаю прычынаю педафіліі. Рыхтуючыся да Амазонскага Сінода навосень 2019 г., усё больш нямецкіх іерархаў выказваюцца за тое, каб у іх дыяцэзіях увесці такія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэформы. Між іншым, прыхільнікам жанатых святароў з'яўляецца біскуп Ульрых Нэймэер з Эрфурту. Маем чарговую праблему: а што са святарамі-геямі, якія – калі цэлібат адменяць – будуць жадаць заключыць "сямейны" саюз з іншым мужчынаю? Здаецца, нямецкі Епіскапат ужо мае адказ на гэтае пытанне.

Падсумоўваючы, варта адзначыць, што 2018 год стаў сапраўдным новым этапам у працэсе будавання "новага" Касцёла. Мы не павінны быць здзіўленыя такім развіццём падзей, бо міна пад сутарэнні Касцёла была падкладзеная адгартацыяй *Amoris laetitia*, якой размытыя і неакрэсленыя фармулёўкі спрыяюць "наваўводзінам". Дактрынальнае адзінства, якім так ганарыўся Каталіцкі касцёл, перастае быць нечым адметным для дадзенае канфесіі. Сённяшні нямецкі каталіцызм смела можна называць версіяй "пратэстантызму 2.0". Але на тым немцы, хіба, не спыняцца: дзе-нідзе ўжо чутно галасы пра тое, каб Касцёл не быў месцам дыскрымінацыі жанчын, а таму цалкам верагодна, што неўзабаве варта спадзявацца з'яўлення над Одраю першых святароў жаночага полу.

Куды ж пойдзе рэшта Касцёла? Гэта тыя выклікі, перад якімі мы сёння апынуліся і якія варта разважыць, пакуль на тое ёсць час і сэнс тое рабіць.

## Літаратура


1. Catholic Church, Code of Canon Law: Latin-English Edition / Catholic Church. – Washington: Canon Law Society of America, 1999. – 751 с.

2. Deutsche Provinz der Jesuiten, Provincial and Bishop stand by Father Wucherpfennig / Deutsche Provinz der Jesuiten. – München: Pia Dyckmans – Presse- & Öffentlichkeitsreferentin, 08.10.2018.

3. Ebner, K., Mesner, M. Attempted Disobedience: Humane Vitae in West Germany and Austria / K. Ebner, M. Mesner // The Schism of '68: Catholicism, Contraception and Humanae Vitae in Europe, 1945–1975, ed. A. Harris. – London: Palgrave macmillan, 2018. – С. 121-160.

4. Nwachukwu, O.O. Those Challenging Cracks of Secularism: In and Beyond / O.O. Nwachukwu. – Bloomington: iUniverse LLC, 2014. – 608 с.

5. Permanent Council of the German Bishops' Conference, Pastoral guidance on the matter of inter-denominational marriages and joint participation in the Eucharist / Permanent Council of the German Bishops' Conference. – Bonn: Press Release German Bishops' Conference, 27.06.2018.

6. Паслясінадальная апостальская адгартацыя Amoris laetitia Святога Айца Францішка / пер. на белар. мову. Мінск: Про Хрысто, 2016. – 232 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова